# Душа гадуе нас

**У аддзеле бібліятэчнага філіяла № 5 Гомеля адбылася прэзентацыя кнігі Дар'і Дарошка і Уладзіміра Чараухіна "Альтанка".**

Гэта трэцяя сумесная кніга сямейнай пары і першая на беларускай мове. На гэтай мове піша свае творы часцей Уладзімір. Але і Дар'я, якая ў паўсядзённых зносінах карыстаецца рускай мовай, добра валодае беларускай. Аб гэтым сведчаць яе творы, змешчаныя ў зборніку.

Вершы Дар'і Дарошка патрабуюць глыбокага асэнсавання. Спасцігнуць іх магчыма толькі пры няспешным, удумлівым чытанні і перачытванні.

*Душу сваю імкнёмся ўратаваць...*
*Гадуем, як спагадлівая маці —*
*Дзіця сваё, у радасці і ў горы.*
*Выхоўваем...*

Цікавыя высновы, якія Дар'я зрабіла на падставе жыццёвага вопыту, змешчаны ў кнізе пад загалоўкам "Думкі на прыпынках". Тут чытачы знойдуць шмат мудрых афарызмаў.

Сярод яе вершаў ёсць жартоўныя замалёўкі. Ёсць пранікнёныя радкі, прысвечаныя каханню. Гэта вершы "Свет багацейшы на адно каханне", "Свет у падарунак", "Каханне — гэта чай з лімонам". Дар'я не абмяжоўваецца звыклай пабудовай вершаваных строф — яна стварае свае, да прыкладу верш "Фрустрацыя".

Творы Уладзіміра цікавыя пасвойму. Многія з іх сведчаць аб схільнасці аўтара да рамантызму. Вершы, створаныя на матэрыяле гістарычнага мінулага, беларускіх міфаў і паданняў, займаюць прыкметнае месца ў зборніку. Гэта "Лойма", "Азярніцы", "Балада", "Ліцвінскі пегас","Вуж".

Чараухін аддае значную ўвагу верлібрам. Прачытаўшы іх, прыходзіш да думкі, што гэта форма выбрана ім не ад няўмення рыфмаваць, а таму, што верлібр у кожным выпадку садзейнічае больш глыбокаму асэнсаванню спрадвечных ісцін, выказаных у вершах. Гэта датычыцца твораў "На нараджэнне Хрыстова", "Яблынька", "Лютаўскі дождж".

Ідучы разам па жыцці, Дар'я і Уладзімір духоўна ўзбагачаюць адзін другога. Кожны выбірае свае тэмы і вобразы. Але агульнае ў іх творчасці — гэта глыбіня думак, моўная культура і беражлівае стаўленне да кожнай напісанай фразы.

**Галіна РАГАВАЯ**